# “Сакрэты куфра прабабулі”
# Музейныя заняткі № 2
## *“Ткацтва і вырабы з тканіны”*
### (на базе музейнага кутка “Хата з матчынай душой”)

**Мэта:** фарміраванне гонару і павагі да культурнай спадчыны беларускага народа.

**Задачы:**

- пазнаёміць з назвамі прадметаў побыту беларусаў і іх ужываннем у штодзённым жыцці;
- спрыяць папулярызацыі і захаванню гісторыка-культурнай спадчыны і традыцый Беларусі;
- ствараць умовы для выхавання зацікаўленасці да вывучэння культурных здабыткаў беларускага народа.

**Ход**

**Настаўнік:** Добры дзень, дарагія сябры! Мы рады бачыць вас зноў у нашым этнаграфічным кутку “Хата з матчынай душой”. І сёння мы працягваем раскрываць сакрэты нашага куфра. А дапамогуць нам у гэтай цікавай справе нашы экскурсаводы.

Тэма сённяшніх заняткаў “Ткацтва і вырабы з тканіны”. Вы зазірнёце ў прабабулін куфар, убачыце, якія вырабы з тканіны стваралі нашы продкі, даведаецеся, якія прылады і прыстасаванні дапамагалі гаспадыням у нялёгкай справе – ткацтва.

**Экскурсавод 1:** Вядома, што ў куфры захоўвалі адзенне і тканае палатно. А дзе можна было ўзяць тканіну і набыць адзенне? У даўнія часы жанчына-гаспадыня ўсё гэта выпрабляла сама. З дзяцінства маці вучылі дачок, а бабулі ўнучак прасці, ткасці, шыць.

**Экскурсавод 2**: *(паказвае **прасніцу**)* Пралі за прасніцаю. Яна складаецца з лопасці, падобнай на лапату або на вясло і днішча. Да лопасці падвешваецца барада – воўна, кудзеля, пянька. Папрадуха левай рукою выцягвае з барады валасінкі – валаконцы, а правай круціць верацяно, навіваючы на яго нітку.

Некалі прасніцу рабілі з суцэльнага кавалка дрэва.Для гэтага дрэва выкопвалі з каранямі, адпілоўвалі ніжнюю частку – камель. Высякалі, гладка вычэсвалі зверху лопасць, а ўнізе пакідалі адзін корань – адгалінаванне – для апоры і каб было на што сесці гаспадыні – папрадусе. Прасніцу, бывала, з густам аздаблялі: выразалі на лопасці фігуркі жывёл, птушак, лісцікі, пялёсткі, узоры.

**Экскурсавод 1:** *(падыходзіць да **калаўрота)*** А вось механічная прылада для прадзення лёну і воўны ў хатніх умовах. Мае рабочыя часткі: кола, педаль, якой кола прыводзілася ў рух, і прадзільны апарат. Што гэта? (Калаўрот).

**Экскурсавод 2**: Калаўрот з’яўляецца неад’емнай часткай жыцця беларусаў. Ён быў у кожнай хаце, у кожнай гаспадарцы. Цемнымі зімнімі вечарамі маладыя дзяўчаты і жанчыны пралі кудзелю і спявалі пра сваю жаночую долю.

*Рыпіць старэнькі калаўрот.*
*Вецер укруціўся ў спіцы.*
*Ля матулі дрэмле кот.*
*Час цячэ па белай нітцы.*

**Экскурсавод 1 :** А каб з нітак атрымаць палатно, былі патрэбны **кросны – ткацкі станок**. Рыпелі панажы, стукалі бёрда з набіліцамі. Хадзілі ўверх – уніз ніты – і ткалася палатно, белае ці расквечанае яркімі ўзорамі. На чарадзейных кроснах ткалася ўсё: ад грубага зрэб’я да тонкага кужалю. І сёння яшчэ ў вясковай хаце можна ўбачыць куфар, дзе ляжыць скарб, вытканы на кроснах.

**Экскурсавод 2:** *(дастае з куфра і паказвае* ***пранік****)*. А вось пранік. Для чаго гаспадыні быў патрэбны гэты прадмет? Палатно, вытканае на кроснах, трэба было давесці да ладу: вымачыць, выбіць пранікам, адбяліць. Звычайна вясною гаспадар запрагаў каня і вёз на калёсах трубкі палатна за вёску, на бераг рэчкі ці возера. Там гаспадыня вымочвала палатно ў вадзе. Потым рассцілала яго на беразе і, стаўшы на калені, біла пранікам - пляскатым драўляным бруском. На роснай траве, пад сонечнымі промнямі палатно за дзень добра адбельвалася. Прыязджаў на кані гаспадар, і палатно, скручанае ў трубкі, зноў адвозілі дахаты. З палатна шылі бялізну, верхняе адзенне, святочныя мужчынскія кашулі, жаночыя кофтачкі і наміткі.

**Экскурсавод 1:** І палатно, і вырабы з яго трэба было час ад часу разгладжваць. І тканыя вырабы разгладжвалі качалкамі. Качалка - няхітрае прыстасаванне: **сама качалка і рубель (валок)** *(дэманструюцца)*. Можа, хто з вас здагадаецца, як трэба ўпраўляцца з гэтымі прадметамі?

**Экскуравод 2:** Само слова рубель паходзіць ад слова «секчы», бо выемкі высякаліся сякерай. Працэс прасавання адбываўся так: сырую бялізну накручвалі на качалку, на якую зверху ўкладвалі рубель зубчастым бокам уніз і раскочвалі, з сілай прыціскаючы рубель абедзвюма рукамі за рукаяць і супрацьлеглы канец. Шчарбіны на рублі разміналі тканіну, і з яе выходзіў апошні бруд. Раскочаная такім чынам бялізна мякчэла і рабілася беласнежнай.

***(Усе зацікаўленыя могуць узяць у рукі качалку і рубель і паспрабаваць прасаваць ручнік)***

**Экскурсавод 1:** Металічныя **прасы** *(паказвае)* з’явіліся ў 18-19 ст. Прасы ўяўлялі сабой металічныя канструкцыі формы, блізкай да сучаснай. Гэта былі прасы, якія напаўняліся вуглямі з печы (прас з жарам, вугальны прас). Трэба было раз-пораз размахваць прасам, каб вуглі разгараліся і грэлі корпус праса. Прасавалі бялізну асцярожна, калі вуглі пераграбалі корпус праса, можна было спаліць тканіну. Такія прасы выкарыстоўвалі ў асноўным для прасавання тканін з ільну, бавоўны, сукна. Прас пасля прасавання патрабавалася чысціць ад вуглеў.

**Настаўнік:** Нарэшце, палатно гатова. Давайце зазірнём у куфар і паглядзім, якія тканыя вырабы стварылі сваімі рукамі нашы прабабулі.

**Экскурсавод 2:** *(паказвае **ручнік**)* Ручнікі не толькі ўпрыгожвалі інтэр'ер хаты, але і шырока выкарыстоўваліся ў беларускіх абрадах. На вяселлі хлебам-соллю на ручніку сустракалі маладых пасля вянчання ў царкве. Ужываўся ручнік і ў якасці падножніка, на які станавіліся маладыя ў час вянчання. Адыходзячы ад аналоя, нявеста старалася цягнуць за сабой і ручнік. Гэта рабілася для таго, каб сяброўкі цягнуліся за ёю, выходзілі замуж. Самых паважаных гасцей падчас урачыстасцей і зараз сустракаюць хлебам-соллю на прыгожых ручніках.

**Экскурсавод 1**: Ручнікі выкарыстоўвалі для побытавых патрэб (выціралі рукі і твар). Прычым на патрэбу сям'і выдзяляецца толькі адзін ручнік, які звычайна вісеў на сцяне. У лазню яго не бралі.

Самым высокім статусам надзяляюцца абрадавыя ручнікі, багата аздобленыя вышыўкай з кветак, геаметрычных сімвалаў і чароўных птушак. Абрадавыя ручнікі выкарыстоўвалі ў святах і абрадах. Ручнікі мелі вялікі сімвалічны сэнс. Напрыклад, ручнікі, якія вешаліся на абразы, мелі сімвалічную сувязь з боскім святлом, з небам, са святлом Сонца. Існавала сімвалічная сувязь ручнікоў з зямлёй – на іх узорах пераважаў ромб, які ў старажытнай славянскай сімволіцы ўвасабляў зямлю, урадлівую глебу. Пра гэта гаворыць і рытуальнае выкарыстанне ручніка разам з хлебам.

**Экскурсавод 2:** Назавіце тканы выраб, якім засцілалі ложак, накрываліся ім, вешалі на сцяну ці клалі на падлогу для ўпрыгожвання інтэр'ера сялянскай хаты? (Посцілкі, дыван)

*Многа людзі працавалі,*
*Сеялі, палолі, рвалі,*
*Як вялося здавён*
*Шаўкавічны лён.*
*Пражу пралі,*
*Кросны ткалі.*
*Вышлі посцілкі на славу –*
*Хоць на ложак,*
*Хоць на лаву!*

**Экскурсавод 1:** Узорныя посцілкі сталі ткаць значна пазней, чым ручнікі і абрусы, бо ложкі ўвайшлі ў быт сялян вельмі позна. Але мастацкае аздабленне іх досыць высокае. Рознымі колерамі вясёлкі, шматлікімі ўзорамі радуюць нас гэтыя вырабы. Смела могуць суседнічаць яны з сучаснымі дыванамі.

**Экскурсавод 2:** А вось абрус - тканы, вязаны або плецены выраб, прызначаны для засцілання стала. Абавязковы атрыбут традыцыйнай сямейнай і каляндарнай абраднасці беларусаў. Яго ўпрыгожвалі вышываным, набіў арнаментам, аплікацыяй, карункамі, махрамі; полкі часта злучалі паскам карункаў (рошва, расшыўка). Рыгор Барадулін пісаў: "Слаўлю чысты абрус, толькі што пакачаны качалкай, каляны, калі яго маці ў нядзелю раніцай засцілае на стол шырокі".

**Экскурсавод1:** (паказвае пояс) Знаёмцеся! Пояс - частка сялянскага адзення. Былі плеценыя або тканыя. Мелі важныя сімвалічныя функцыі, іх выкарыстоўвалі ў абрадах. Аздобленыя розным арнаментам, упрыгожаныя кутасамі.

*Паясочак сіні – недзе ад матулі,*
*А чырвоны, яры – мужу да кашулі.*
*А вось гэты – гожы, доўгі з кутасамі*
*Падпярэзваў святам бабін брат часамі.*
*А шырокі пояс, зложаны ў дзве столкі,*
*Падпярэзваў колісь дзед бабулін толькі.*

Ларыса Генію́ш

Асаблівае месца сярод традыцыйных тэкстыльных вырабаў займаюць тканыя паясы. На ўвесь свет прынеслі славу Беларусі слуцкія паясы, якія ткалі з залатых, сярэбраных і шаўковых нітак. З поясам у беларусаў звязаны прыкметы і павер'і.

**Настаўнік:** Дзякуй нашым экскурсаводам, якія дапамагалі нам разгадваць сакрэты прабабулінага куфра.

Давайце падвядзём вынікі нашых заняткаў.

- Назавіце 3 новыя словы, якія вы даведаліся на занятках.
- Назавіце 3 цікавыя рэчы, з якімі вы сёння пазнаёміліся.
- Назавіце 3 прадмета, якія вас здзівілі.

Падводзячы вынікі, я хачу сказаць, пакуль жыве наша памяць, пакуль жыве наша культура – будзе жыць і квітнець наша Радзіма. Пакуль наша мінулае хвалюе нас і нам не абыякавыя падзеі дзён мінулых, мы жывем як нацыя, а значыць, мы моцныя духам і мы адзіныя. Без мінулага няма сучаснасці, а значыць і надзеі на будучае.